ПРЭЗЕНТАЦЫІ

# АЛФАВІТНЫЯ ПРЫПЫНКІ Ў ГОРАДЗЕ-СПАДАРОЖНІКУ

**СКІДЗЕЛЬ. Пераможца Абласнога літаратурнага конкурсу імя Максіма Багдановіча ў намінацыі «Дзіцячая літаратура», паэтэса, член СПБ Тамара МАЗУР прэзентавала сваю пераможную кнігу.**




Паэтэса, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамара Мазур правяла бліц-прэзентацыю сваёй дзіцячай кніжкі «Алфавітныя прыпынкі дзяўчынкі Літарынкі» ў групе падоўжанага дня СШ № 3 г. Скідзеля. Выхаванцы педагога Марыны Аляксееўны Вабішчэвіч праявілі вялікую цікавасць да гульнёвай праграмы, пакладзенай у сюжэт кнігі, падчас якой лёгка запамінаецца многа ўнікальных беларускіх слоў і развіваецца гутарковая мова.

Кніжка яркая, мае бліскучую ламінаваную вокладку, кожная яе старонка аформлена ў выглядзе стылізаванага аўтобуснага прыпынка, на якім можна і верш пачытаць, і малюнак размаляваць, і выканаць цікавае моўнае практыкаванне.

Дарэчы, кніга «Алфавітныя прыпынкі дзяўчынкі Літарынкі» сёлета прынесла яе аўтару перамогу у Абласным літаратурным конкурсе імя Максіма Багдановіча ў намінацыі «Дзіцячая літаратура». Выданне можа стаць цудоўным навагоднім падарункам дзецям і ўнукам.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На фота:** падчас бліц-прэзентацыі кнігі Тамары Мазур «Алфавітныя прыпынкі дзяўчынкі Літарынкі». СШ № 3 г. Скідзеля. Снежань 2024 года.


5 снежня






5 декабря
Домашняя работа
2 „А"
2 „Б"
3 „А"
Алфавітныя